Л. К. КУХТО

# МАЁНТКАВАЯ СПАДЧЫНА ТЫШКЕВІЧАЎ У СВІСЛАЧЫ / TIŠKEVIČIŲ TURTAS Į SVISLOCH

L. KUKHTO

# ESTATE HERRITAGE OF TYSHKEVICHY IN SVISLACH

*In this article the author describes magnate residence Tyshkevichs end XVIII – the first third of the XIX century in Svislach. And if ancestors collected wealth for a long centuries: by the service, by inheritance, or as a dowry, the descendants, as a result of various circumstances, were compelled to sell the inheritance. Wealth disappeared, magnate residences flowering ended. And where there was so beautiful and happy, the music was playing, was the ghost of the former life.*

Прадстаўнікі роду Тышкевічаў былі найбуйнейшымі зямельнымі ўладальнікамі на тэрыторыі сучасных Беларусі, Літвы, Украіны, Польшчы. Захаваліся іх гарадскія рэзідэнцыі, большай часткай вытрыманыя ў стылі класіцызму, у Варшаве, Кракаве і Вільні. Загарадныя палацы былі ўзведзены Тышкевічамі ў Лагойску, Палангзе, Лентварысе, Троках, Біржах [2, с. 681].

Адным з вядомых прадстаўнікоў лагойскай лініі графскага роду Тышкевічаў герба «Ляліва» быў Тадэвуш Тышкевіч (1774–1852), сын кашталяна жамойцкага Станіслава Антонія Тышкевіча (1727–1801) ад першага шлюбу з Евай Ганнай Белазор. Яго братамі былі – ротмістр пяцігорскай харугвы Ежы Тышкевіч і генерал польскай арміі Януш Тышкевіч, дзяржаўны і ваенны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага і Расійскай імперыі. Т.С. Тышкевіч атрымаў у спадчыну ад свайго бацькі тытул графа «на Лагойску і Бярдычаве», а таксама маёнтак Бальвяржышкі (літ. Бальбярышкіс).

Тадэвуш Тышкевіч скончыў Віленскую школу-пансіён, затым вучыўся ў Варшаўскім піярскім калегіуме. З 1790 г. служыў у конным гвардзейскім Мірскім палку, у 1792 г. – харунжы Пінскай пяцігорскай (лёгкаконнай) брыгады арміі Вялікага Княства Літоўскага. У тым жа 1792 г. удзельнічаў у руска-польскай вайне.

У час паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі ў 1794 г. Тышкевіч служыў ад'ютантам генерала Якуба Ясінскага, які даручыў яму камандаваць адным з паўстанцкіх атрадаў у Вільні. Удзельнічаў у абароне Прагі (прадмесце Варшавы) ад рускай арміі, затым эмігрыраваў у аўстрыйскую Галіцыю.

З 1801 г. Тадэвуш Тышкевіч знаходзіўся ў Парыжы, дзе скончыў ваенную школу інжынераў і артылерыстаў. У 1805 г. пераехаў у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Варшаву і ў 1806 г. сфарміраваў конны атрад. У 1809 г. у чыне палкоўніка 2-га ўланскага палка браў удзел у аўстра-французскай вайне, за што атрымаў ордэн Virtuti Militari. У 1812 г. уступіў у Генеральную канфедэрацыю Каралеўства Польскага, якую апекаваў французскі імператар Напалеон.

У 1812 г. падчас руска-французскай вайны генерал Тадэвуш Тышкевіч змагаўся на чале кавалерыйскай брыгады (5-ы корпус Юзэфа Панятоўскага) на французскім баку. Удзельнічаў у баях пад Мірам, Смаленскам і Барадзінскай бітве. Пад Мядынню паранены Т. Тышкевіч трапіў у палон, і яго адправілі ў Астрахань. У 1814 г. ён быў вызвалены і вярнуўся ў Варшаву.

10 снежня 1816 г. Т. Тышкевіч атрымаў у спадчыну Свіслацкае графства ў Ваўкавыскім павеце. Жыў у Свіслачы.

Гісторыкам Свіслач вядома з сярэдзіны XIII ст., калі разам з Гродзенскім, Навагародскім, Ваўкавыскім існавала і Свіслацкае ўдзельнае княства на чале з князем Ізяславам. Першая згадка пра паселішча сустракаецца ў Іпацьеўскім летапісе і датуецца 1256 г. Свіслач разрасталася дзякуючы свайму выгаднаму геаграфічнаму становішчу і ўжо ў 1523 г. атрымала статус мястэчка.

З 1754 г. гаспадаром Свіслачы стаў граф, генерал літоўскіх войскаў Казімір Тышкевіч. Ён быў вялікім аматарам палявання, для чаго тут ствараліся звярынцы, паселішчы паляўнічых, егераў, сабакаводаў, нагоншчыкаў. Асаблівае месца ў гісторыі Свіслачы заняў перыяд з 1778 г., калі яе гаспадаром стаў сын Казіміра Тышкевіча Вікенцій, сенатар Вялікага Княства Літоўскага. Падчас вучобы ў парыжскім універсітэце ён захапіўся ідэямі яшчэ маладой буржуазіі. Пасяліўшыся ў Свіслачы, заняўся гаспадарчымі пераўтварэннямі. Ён здейсніў рэканструкцыю Свіслачы, уладкаваў у цэнтры мястэчка вялікую рыначную плошчу, на якой праходзілі знакамітыя кірмашы. Каля рыначнай плошчы знаходзіліся фарны касцёл, пры ім вежа з гадзіннікам, недалёка ад касцёла – уніяцкая царква. На плошчы стаялі тры карчмы і «кафэнгаўз». У XVIII ст. графам Вікенціем Тышкевічам быў закладзены парк і пабудаваны ў ім палац – драўляны аднапавярховы П-падобны ў плане будынак, завершаны гонтавым дахам складанай канфігурацыі; з анфіладнай планіроўкай. У палацы меліся вялікая парадная зала, 12 жылых пакояў, кавярня і іншыя гаспадарчыя памяшканні. У пачатку XIX ст. у парку пастаўлены аднапавярховы драўляны будынак пад гонтавым дахам, прызначаны спецыяльна для тэатра:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тут мелася вялікая тэатральная зала (212 м кв.) і 2 танцавальныя залы (83,5 м кв.) [1, с. 432].

Вікенцій Тышкевіч задумаў ператварыць мястэчка ў горад з развітой прамысловасцю. А для гэтага патрэбны былі грошы. Атрымаць іх ён мог, прадаючы лес. І пачалася высечка цэлых лясных кварталаў. Пушча паступова адыходзіла, а на месцы векавых бароў паўсталі сённяшнія вёскі Глушко і Бязводнікі, Якушоўка, Качкі і інш. Узніклі і лясныя промыслы – смалярня, папяровая фабрыка ў Нязбодзічы. У Свіслачы былі свой заапарк, тэатр. Горад быў упрыгожаны паркам, 20-мятровым абеліскам, уязнымі варотамі. У 1805 г. Тышкевіч на свае сродкі заснаваў ў Свіслачы гімназію – першую свецкую школу ў Беларусі. У розны час гімназію скончылі К. Каліноўскі, В. Кавалеўскі, С. Горскі, Ю. Крашэўскі, Р. Траўгут, Н. Орда і інш. У 1810-х гг. на тэрыторыі Свіслацкай пушчы, а з часоў Тышкевічаў – Свіслацкай дачы (цяпер Белавежы), быў пабудаваны гасцявы дом графа Тышкевіча. Гэта месца па сённяшні дзень з’яўляецца ўнікальным найбуйнейшым на тэрыторыі Еўропы масівам рэліктавага першабытнага лесу, пераважна хваёвых і шыракалісцевых.

У 1816 г. граф Вікенцій памёр, а ўсё яго багацце атрымаў у спадчыну пляменнік Тадэвуш Тышкевіч. Ён таксама любіў паляванне, але гаспадарчым справам не надаваў такога значэння, як яго дзядзька. У 1830 г. пачалося так званае лістападаўскае паўстанне супраць Расійскай імперыі. У ім актыўна ўдзельнічаў ўладальнік Свіслачы і Свіслацкай дачы Тадэвуш Тышкевіч. Падчас паўстання генерал Тадэвуш Тышкевіч быў старшынёй часовага ўрада Літвы, створанага пры яго штабе. У 1830–1831 гг. выбухнула паўстанне работнікаў Белавежскай пушчы, якое было таксама падтрымана ўладальнікам Свіслацкай дачы.

У 1831 г. пасля падаўлення паўстання ўся маёмасць і Свіслацкая дача ў Т. Тышкевіча былі канфіскаваны. Лясны масіў плошчай у 25 тыс. дзесяцін у 1832 г. быў далучаны да Белавежскай пушчы. Тадэвуш Тышкевіч выехаў у Прусію, адтуль у Дрэздэн, а ў пачатку 1852 г. – у Парыж, дзе памёр.

Праз стагоддзе, у 1933 г., трынаццаць нашчадкаў Тышкевіча на чале з графіняй Аленай адсудзілі ў Польскай дзяржавы каля 15 тыс. гектараў лесу і па старадаўніх чарцяжах на месцы былога будынка, які не захаваўся, узвялі дом-дачу, куды, як і раней, прыязджаюць яго ўладальнікі і паляўнічыя. Гэты дом, пабудаваны ў 1936 г., захаваўся да сёння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яго архітэктурны стыль уласцівы менавіта для тых часоў, калі падобнымі дачамі абзаводзіліся многія саноўныя асобы. Выключэнне складае толькі дах з ацынкаванага жалеза, зроблены ўжо ў нашы дні замест ранейшай драніцы. Тры паверхі будынка выкананы ў розных стылях, якія дапаўняюць адзін аднаго. Традыцыйная камінная зала на першым паверсе, шырокая парадная лесвіца вядзе на другі. Яе драўляныя парэнчы выгнуты і ўпрыгожаны двума вялікімі шарамі са шкельцамі з суцэльнага дрэва. Вузкая вінтавая лесвіца вядзе на трэці паверх. Яе пры жаданні можна ўвогуле схаваць ад староніх вачэй – для гэтага дастаткова зачыніць невялікія дзверцы, і яна схаваецца за імі.

Днём жа, асабліва ў летнюю пару, гаспадары і госці хутчэй за ўсё бавілі час не ў памяшканні, а ў парку-дэндрарыі, які прылягае да дома. У парку па сённяшні дзень захаваліся дрэвы і кусты, якія не растуць на тэрыторыі пушчы. Найбольш прыкметныя чырвоны дуб і веймутава хвоя. Ландшафтны дызайн дзівіць многіх, хто ўпершыню наведвае Свіслач. На зялёным газоне сярод прыгажуноў-дубоў і высокіх зялёных пірамідак туй размясціліся зробленыя з лазы, трыснёга і інш. казачныя героі, жывёлы і альтанкі розных памераў і мудрагелістай формы, а таксама разнастайныя малыя архітэктурныя формы і многае інш.

Зямельныя ўладанні былі зарэгістраваныя ў Гродзенскім акруговым судзе як «Пушча Свіслацкая», і ў 1936 г. яе перадалі ў арэнду фірме «Свіслач – таварыства з абмежаванай адказнасцю», якую ўзначаліў інжынер Стэфан Манджыкоўскі. Яго рэзідэнцыяй стала Жаркаўшчына, ціхая маленькая вёсачка, акружаная з усіх бакоў лясамі. У XVIII ст. сядзібу генерал-лейтэнанта польскіх войскаў, сенатара Тадэвуша Тышкевіча называлі «кавалачкам раю». Захаваліся цікавыя звесткі аб тым, што меў намер тут асталявацца і пажыць знакаміты філосаф і пісьменнік Жан-Жак Русо. Справа ў тым, што ў 1778 г. у Парыж прыехаў Антоній Тызенгаўз, падскарбій літоўскі (міністр фінансаў і эканомікі). Ведаючы, што філосаф працуе над праектам дзяржаўнай перабудовы Польшчы, і ведаючы таксама яго негатыўныя адносіны да людскога натоўпу і вялікім гарадам, пра імкненне жыць у натуральным асяроддзі, Тызенгаўз прапанаваў Русо для пражывання і творчасці «самае адасобленае месца ў Еўропе» – белавежскі лес. Тызенгаўз абавязаўся пакрыць усе выдаткі па набыцці дадзенага маёнтка і абсталяванні новага жылля. Больш за тое, дом павінен быць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

збудаваны па плане самога Русо. Русо амаль пагадзіўся, але з-за пэўных абставін праект не быў ажыццёўлены [2, с. 3].

Узноўлены раскошны асабняк, манумент Ф. Тышкевічу, падмуркі былых будынкаў касцёла, пякарні, музея. Надпіс на мармуровым мануменце выкананы сваякамі апальнага генерала на французскай мове: «Тышкевіч – генерал і сенатар Польшчы. Ваяваў у Латвіі пад кіраўніцтвам Ясінскага, у Прусіі – пад кіраўніцтвам Напалеона, у Галіцыі і Расіі – пад кіраўніцтвам Панятоўскага. Тры разы быў у ссылцы, правёўшы ў зняволенні 21 год. Як падчас войнаў, так і ў мірны час цалкам аддаваў сябе служэнню Радзіме. Нарадзіўся 12 сакавіка 1774 г., памёр 21 красавіка 1852 г. Гэты манумент пастаўлены ў яго памяць». Наверсе манумента знаходзіўся бронзавы бюст сенатара, на жаль, знік. У цяперашні час застаўся толькі пастамент з гэтым надпісам і паглыбленнем для мацавання бюста. Надпіс на французскай мове тлумачыцца тым, што Тышкевіч апошнія 20 гадоў жыцця правёў у Парыжы, дзе і быў пахаваны. Але на могілках «Пэр Ляшэз» падтрыманне яго магілы каштавала нямала, то сваякі ў 1933 г. перавезлі астанкі з надмагіллем ў яго былы маёнтак.

У гады Другой сусветнай вайны магіла была разбурана, а пастамент, ужо без бронзавага бюста, апынуўся ў лесе непадалёк ад маёнтка. Падчас рэстаўрацыйных работ у 1988–1989 гг. былы дырэктар Белавежскай пушчы Сяргей Балюк распарадзіўся ўсталяваць пастамент на тэрыторыі сядзібы побач з асабняком у Свіслацкім лясніцтве. Хоць дакладнае месца, дзе быў перапахаваны апальны генерал, пакуль не вядома.

Сядзіба графа Тышкевіча ўключана ў адзін з турыстычных маршрутаў па Белавежскай пушчы, якая сёння адно з любімых месцаў турыстаў, асабліва аматараў здабыць пушчанскага звера. Трохпавярховы, выфарбаваны ў блакіт драўляны дом адрэстаўрыраваны і пераабсталяваны ў гасцініцу. У ім любяць спыняцца замежныя паляўнічыя.

Што каштоўнае ў адпачынку тут, дык гэта тое, што сядзіба добра захавалася і мае практычна ідэнтычны мінулым гадам выгляд. Дом можна не толькі агледзець, але і пажыць у ім, у гістарычна значным месцы акунуцца ў атмасферу мінуўшчыны і адчуць: тут лепш разумеецца, якія мы сёння.

*1.* Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – 620 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*2*. Вялікае Княства Літоўскае: энцыкл. : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – 2-е выд. – Мінск : БелЭн, 2007. – 792 с.
*3. Раманчук, Г.* У сядзібе графа Тышкевіча меў намер абгрунтавацца філосаф Жан-Жак Русо / Г. Раманчук // Гродзенская праўда. – 2011. – 17 жн. – С. 3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ